Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны
музей Якуба Коласа

КАЛАСАВІНЫ

Матэрыялы XXX навуковай канферэнцыі,
прысвечанай134-й гадавіне з дня нараджэння
народнага паэта Беларусі Якуба Коласа
і 110-годдзю творчай дзейнасці Якуба Коласа

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3 лістапада 2016 г., Мінск

Scanned by CamScanner

Выданне падрыхтавана па заказу
Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа

Складальнікі:
З. М. Камароўская, дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа,
Ю. В. Кішкурна, вядучы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.

Фота: Н. Купрэвіч
На вокладцы: У. Басалыга. Якуб Колас. 1942 г.
Дызайнер: К. Антонава

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Каласавіны: Матэрыялы XXX навуковай канферэнцыі, прысвечанай 134-й гадавіне з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Якуба Коласаі 110-годдзю творчай дзейнасці Якуба Коласа
Мінск: РИФТУР, 2017. – 200 с.

Зборнік тэзісаў, дакладаў і паведамленняў з'яўляецца працягам вывучэння шматграннай спадчыны народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. Аўтары звяртаюцца да невядомых першакрыніц, даследуюць актуальныя праблемы коласазнаўства.
Адрасаваны навуковым работнікам, выкладчыкам, коласазнаўцам.

© Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, 2017
© УП «РИФТУР», афармленне, 2017

Scanned by CamScanner

Ермаковіч К.
Спецыфіка аглядавага вывучэння творчасці Якуба Коласа ў кантэксце літаратуры ваеннай тэматыкі: аксіялагічны падыход.....с. 59

Жардзецкая А.
Адметнасць і арганічнасць «Казак жыцця» ў мастацкім самавыяўленні Якуба Коласа.....с. 66

Жыбуль В.
Якуб Колас ці Алесь Гурло?: Да пытання пра адрасата верша «Паэту» Віктара Казлоўскага.....с. 72

Калясінскі В.
Скульптура па творах Якуба Коласа.....с. 80

Камароўская Л.
«Славутыя імёны Бацькаўшчыны» (па творчасці Якуба Коласа) як інавацыйная форма работы з экскурсантамі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі .....с. 82

Клімуць Я.
Умоўнасць і рэаліі жыцця.....с. 87

Курыленка Г.
Асноўныя архетыпы ў апавяданнях «Казкі жыцця» Якуба Коласа.....с. 92

Кухарава Н.
Асаблівасці творчага стылю ў вершаваных творах Якуба Коласа.....с. 97

Лугоўскі А.
Погляды Якуба Коласа і Максіма Танка на народную педагогіку.....с. 103

Манкевіч А.
Яна перакладала Якуба Коласа.....с. 110

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Scanned by CamScanner

Галіна Курыленка

Асноўныя архетыпы ў апавяданнях «Казкі жыцця» Якуба Коласа

Агульнавядома, што філасофія як навука зарадзілася ў эпоху антычнасці, а больш дакладна – у культуры Старажытнай Грэцыі. Цалкам самастойнае значэнне яна набывае толькі падчас эпохі Асветніцтва – прыкладна ў XVIII стагоддзі.

Што ж датычыць Беларусі, то пэўныя гістарычныя ўмовы не дазволілі ў акрэслены час (эпоху Асветніцтва) беларусам адкрыта прэзентаваць сябе як нацыянальных філосафаў. Не было магчымасцяў для развіцця дадзенай з'явы.

Разам з тым нельга не адзначыць, што ўжо ў папярэднія эпохі надзвычай паспяхова ішло фарміраванне нацыянальнай філасофскай думкі на Беларусі. Тут варта прыгадаць дзейнасць К. Тураўскага, Мікалая Радзівіла Чорнага, Льва Сапегі, Францыска Скарыны, Міколы Гусоўскага, Сімяона Полацкага і г. д.

На жаль, мы не маем свайго ўласнага Канта, Вальтэра ці Ж.-Ж. Русо. Тым не менш было б няправільным сёння цалкам адмаўляць наяўнасць нацыянальнай філасофіі ў беларускай культуры.

Па сутнасці, функцыю філасофіі ў беларускай культуры ў пэўны перыяд свайго развіцця стала выконваць нацыянальная літаратура.

Важнейшай адметнасцю беларускай вербальнай культуры (літаратуры) з'яўляецца паступовае фарміраванне ўласнай светапогляднай сістэмы як формы грамадскай свядомасці, сістэмы фундаментальных ідэй, якія тэарэтычна тлумачылі адносіны беларусаў да свету ў яго цэласнасці, месца беларусаў у гэтым свеце, сэнс чалавечага жыцця і сэнс існавання самаго сусвету. Не існуе адзінага паняцця філасофіі. Кожны са знакамітых філосафаў вызначае яе па-свойму. Так, пазнаць існае, вечнае, сапраўднае імкнуўся Платон, даследаваць прынцыпы і пачатак рэчаў – Арыстоцель. Кант стварае вучэнне аб абсалютных межах усялякага магчымага пазнання. А вось Сакрат усім нам параіў пазнаць спачатку саміх сябе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Scanned by CamScanner

Беларуская ж культура прапануе чалавецтву свой вопыт эўдаманіі – вучэння пра «простае шчасце людское». Ужо напачатку XX стагоддзя цалкам сфарміраваным, навукова сталым выступае авангард беларускай філасофіі: М. Багдановіч, В. Ластоўскі, І. Канчэўскі, У. Самойла, Абдзіраловіч і г. д.

Сярод прадстаўнікоў беларускай культурфіласофіі, бадай, самае адметнае месца па праву займае Якуб Колас і яго мастацка-філасофская творчасць.

«Казкі жыцця» Якуба Коласа з'яўляюцца заканамерным вынікам развіцця нацыянальнай філасофіі як каштоўнаснай арыентацыі на невычэрпнасць магчымасцяў рэальнага прадметнага свету. Тып мыслення дадзеных «казак» можна ахарактыразаваць як ахоўна-кансерватыўны. Той тып мыслення, які закліканы сістэмна акумуляваць, зберагчы і захаваць беларускі этнас.

Пісьменнік-філосаф перадае ў сваіх «Казках жыцця» жыццястойкасць шкалы маральна-этычных каштоўнасцяў, што можна растлумачыць устойлівым характарам рэалізаваных у дадзеных тэкстах першапачатковых, архетыпных комплексаў.

Усе асноўныя вобразы ў «казках» Якуба Коласа з'яўляюцца архетыпічнымі. Яны надзяляюцца сімвалічным сэнсам, што зыходзіць з калектыўнага і асабістаснага бессвядомага. Аўтар сістэматычна і паслядоўна выкарыстоўвае вобразы-сімвалы ў іх класічнай агульнапрызнанай інтэрпрэтацыі. Разам з тым сімвалічныя мастацкія вобразы Якуба Коласа не расшыфроўваюцца цалкам да канца, а, наадварот, паступова набываюць шматзначнасць сэнсавых адценняў, гнасеалагічную невычарпальнасць. Даследчык В. П. Жураўлёў гаварыў аб тым, што Якуб Колас ніколі не быў прыхільнікам нейкай жорсткай завершанасці мастацкага сюжэту сваіх твораў і іх «расшыфроўкі» да канца, хоць псіхалагічны малюнак у яго творах заўсёды надзвычай дакладны, багаты і шчодры на яркія дэталі і падрабязнасці.

Напрыклад, адны ўспрымаюць вобраз дуба як сімвал жыццястойкасці, моцы, а другія – як сімвал мудрасці. Вада таксама часам трактуецца як сімвал ачышчэння, але, дарэчы, акадэмік І. Я. Навуменка лічыў, што «Жывая вада» Якуба Коласа прысвечана падзеям першай рускай рэвалюцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Scanned by CamScanner

Варта звярнуць увагу на тое, што вобразы-архетыпы Якуба Коласа маюць пэўную дыферэнцыяцыю, строгую класіфікацыю. Яны характарызуюцца лаканізмам і ўніверсалізмам. У аснову коласаўскай філасофіі пакладзены сілы і вобразы прыроды (макракосма), магутнейшыя прыродныя стыхіі, такія як :

1) зямля («…мы – дзеці зямлі») [2, с. 112];
2) дрэва (часцей менавіта дуб);
3) вецер (паветра);
4) вада (ручай);
5) камень (гара);
6) агонь.

Неабходна падкрэсліць, што ў «казках» Якуба Коласа задзейнічаны асноўныя філасофскія першаэлементы светабудовы. Для параўнання: у кітайскай культуры (у адной са старажытнейшых філасофій – філасофіі даасізма) лічылася, што сусвет складаецца з пяці элементаў ці стыхій – гэта дрэва, зямля, вада, агонь, метал.

Мы бачым, што беларускі філасофскі тэзаўрус мала чым адрозніваецца ад іншых сусветнавядомых старажытных аналагаў. Нават больш таго, у нашай культуры ёсць тое, чаго не было ў кітайскай ці італьянскай культурах, – гэта архетып дрэва.

Так, у тэксце казкі «Адзінокае дрэва» Якуб Колас вырашае праблему дуалізму. Дзякуючы выкарыстанню спрадвечнага архетыпа дрэва, аўтару ўдаецца сфармуляваць адну з асноўных філасофскіх канцэпцый: *«…кожная рэч мае два бакі: паказны і праўдзівы»* [2, с. 11].

Варта адзначыць, што Якубу Коласу нават удаецца не толькі акрэсліць праблему, а і паказаць выйсце з яе. Пісьменнік-філосаф сцвярджае, што калі цяжка распазнаць, хто ёсць хто, і здаецца, што табе здрадзілі, то трэба *«…пусціць глыбей карэнні ў зямлю»* [2, с. 13]. Аўтар далікатна падводзіць чытача да думкі, што толькі самадастатовы, незалежны чалавек здольны зразумець «тайны-глыбіні» чалавечага існавання. Устойлівы архетып дрэва ўвасабляе сабой абагуленыя рысы беларускага народа: разважлівасць, даверлівасць, цярплівасць, уседаравальнасць, жыццястойкасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Scanned by CamScanner

Апроч дрэва, у творы задзейнічаны і такія архетыпы як вецер (паветра) і вада (ручай). Дадзеныя стыхіі напачатку імкнуцца перацягнуць дрэва кожная на свой бок, гэта значыць, у нейкім сэнсе пазбавіць яго незалежнасці, самастойнасці, потым проста пакідаюць яго.

Такім чынам, у «казцы» «Адзінокае дрэва» перадаецца адзін з выключных канцэптаў беларускай філасофіі: непарыўная, мацнейшая сувязь мікракосма (чалавека) і макракосма (зямлі і прыроды), неабходная для паспяховага функцыявання беларускага соцыума.

Тэкстуальнае палатно Якуба Коласа «Жывая вада» – гэта своеасаблівы роздум-экскурс у гісторыю фарміравання беларускага этнасу. Тут гаворыцца аб вытоках стварэння дзяржавы, дзе было ўсё:

1) зямля («*Багатая, урадлівая была іх зямля*» [2, с. 3])
2) вада («*…гэтую раку людзі называлі Жывою Вадою*» [2, с. 3]).

Гэта дзве раўнацэнныя стыхіі, якія не могуць існаваць адна без другой. Яны ўзаемазвязаныя і ўзаемапараўнальныя. Зямля нараджае ваду. Вада жыўіць зямлю. Гэта як у кітайскай філасофіі паняцці «інь» і «янь». Згодна з натурфіласофскай канцэпцыяй, стыхія вады дае сілу зямлі і наадварот. Вада – крыніца жыцця, яна валодае жыццёвай энергіяй. Вада, рэкі – гэта своеасаблівыя артэрыі зямлі, якія напаўняюць яе жыццёвай сілай. Невыпадкова спрадвечна нашы продкі сяліліся абавязкова каля вады, часцей на сутоках рэк, як, напрыклад, віцябчане, што некалі выбралі месцам свайго паселішча сутокі ажно трох рэк адначасова.

Але вада можа быць жывой, а можа быць і мёртвай. Дарэчы, сімвал апошняй – мёртвай – вады і як яе антыпод – жывой – даволі часта ўжываецца ў вуснай народнай творчасці. Напачатку жыццё паабапал ракі з Жывой Вадой было шчаслівым. Ды шчасце тое было нядоўгім: з'явілася гара, што перакрыла плынь Жывой Вады. А вось архетып гары тут выступае як сімвал зла, што нерухомай глыбай перакрывае ўсё жывое.

І як вынік – некалі цудоўны куточак зямлі становіцца Мёртвым Полем. Людскія слёзы, гнеў трансфармуюцца ў цёмную хмару (з аднаго боку), а з другога – сама Жывая Вада паціхеньку размыла сабе перакрыты гарой шлях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Scanned by CamScanner

У рэшце рэшт згінула гара, развеялася пяском і пылам па полі. Тым не менш фінал твора вельмі аптымістычны. Зноў Якуб Колас праз сваю творчасць не толькі акрэслівае праблему, але і паказвае шляхі яе рэалізацыі.

Як лагічны працяг папярэдне ўзнятай праблемы выступае «казка» «У балоце» (чытай: у соцыуме). Дамінантай дадзенага тэксту аўтар робіць фразу *«бяда… разрасталася»* [2, с. 7]. Асноўнай праблематыкай тут з'яўляецца праблема пошуку ратунку, праблема ўлады. Народ гатовы дапамагчы, але паны (кіраўнікі) не лічаць іх за людзей, і як вынік – усе разам *«…глыбей у гразь лезлі»* [2, с. 7].

У творы «Чыя праўда?» асноўным архетыпам выступае дуб, як сімвал прарока, што *«…найбольш разважлівы спаміж усіх тутэйшых дубоў»* [2, с. 25]. Тут, між іншым, ідуць сур'ёзныя філасофскія разважанні аб тым, што «лепш зусім не мець жалудоў (дзяцей), чым мець іх дзеля свіной уцехі». Апроч таго, тут, як вынік філасофскіх разважанняў, адбываецца выкрашталізацыя адной з важнейшых жыццёвых дылем: *«Лепш быць нашчасным, але відушчым, чымся шчаслівым ды сляпым»* [2, с. 27].

Такім чынам, беларуская зямля ў «казках» Якуба Коласа – гэта мадэль светабудовы ў мініяцюры. З пазіцый спрадвечнай народнай мудрасці пісьменнік імкнуўся па-філасофску раскрыць значэнне сапраўдных маральных каштоўнасцяў, паказаць жыццё ў яго вартасным аспекце, заклікаў нас быць беражлівымі да роднай зямлі і да яе духоўных здабыткаў.

Літаратура

1. *Колас, Якуб. Збор твораў: у 20 т. / Якуб Колас. – Мінск: Беларус. навука, 2009. – Т.7. – 502 с.*
2. *Колас, Якуб. Казкі жыцця / Якуб Колас. – Мінск: Нар. асвета, 1976. – 110 с.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Scanned by CamScanner